ЗАЦВЕРДЖАНА
Пастанова
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
07.08.2025 № 140

# Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» для XI класа ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, з беларускай мовай навучання і выхавання

(павышаны ўзровень)

# ГЛАВА 1
# АГУЛЬНЫЯ ПЛАЖЭННІ

1. Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» (далей – вучэбная праграма) прызначана для вывучэння вучэбнага прадмета на павышаным узроўні ў XI класе ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі.

2. Дадзеная вучэбная праграма разлічана на 136 гадзін (4 гадзіны на тыдзень, рэзервовы час – 2 гадзіны).

Педагагічны работнік мае права з улікам пазнавальных магчымасцяў вучняў змяніць колькасць вучэбных гадзін і паслядоўнасць вывучэння матэрыялу ў межах вучэбнага часу, прызначанага для засваення зместу раздзелаў. Рэзервовы час можа быць выкарыстаны для кантролю ведаў і ўменняў вучняў.

3. Мэта вывучэння вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» на павышаным узроўні – навучанне, развіццё і выхаванне асобы вучня на аснове асэнсавання ім гістарычнага вопыту беларускай нацыі ў кантэксце гісторыі чалавецтва, фарміравання сістэмы гістарычных ведаў, традыцыйных каштоўнасцяў, гістарычнай памяці, нацыянальна-культурнай і грамадзянскай ідэнтычнасці, якія забяспечваюць эфектыўнае прымяненне гістарычных ведаў і ўменняў у вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і ў сацыяльных практыках; забеспячэнне засваення вучнямі кампетэнцый, неабходных для прафесійнага самавызначэння, працягу адукацыі па выбраным кірунку.

4. Задачы вывучэння вучэбнага прадмета «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» на павышаным узроўні:

сістэматызацыя і абагульненне ведаў вучняў пра гісторыю Беларусі XIX – першай чвэрці XXI в. у кантэкстуальным адзінстве з асноўнымі тэндэнцыямі сусветнага грамадска-гістарычнага працэсу; асэнсаванне вучнямі гістарычнага працэсу, разуменне імі заканамернасцей, тэндэнцый гістарычнага развіцця і месца Беларусі ў гістарычным працэсе;

фарміраванне светапоглядных перакананняў і каштоўнасных арыенціраў вучняў на аснове засваення імі гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі як часткі сусветнай спадчыны, фарміраванне гістарычнай памяці і нацыянальнай ідэнтычнасці, прыняцце і прытрымліванне ідэй грамадзянскай супольнасці, прававой і дэмакратычнай дзяржавы;

развіццё гістарычнага мыслення навучэнцаў, удасканаленне агульнавучэбных і спецыяльных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходных для самастойнага пазнання гістарычнай рэчаіснасці, прымянення гістарычных ведаў у сучаснай сацыяльнай практыцы,

свядомага прафесійнага самавызначэння і працягу адукацыі па выбраным кірунку.

5. У працэсе засваення зместу вучэбнага матэрыялу рэкамендуецца выкарыстоўваць прадуктыўныя, часткова-пошукавыя (эўрыстычныя), праблемнага выкладу, даследчыя (практычныя) метады.

Рэкамендаваныя віды вучэбна-пазнавальнай дзейнасці: асэнсаванае ўзнаўленне тэарэтычнага і фактолагічнага зместу вучэбнага матэрыялу, работа з рознымі крыніцамі гістарычнай інфармацыі; лакалізацыя гістарычных працэсаў, з'яў і падзей у часе і прасторы; перакадзіраванне вербальнай інфармацыі ў наглядна-вобразную і наадварот; распрацоўка вучэбных праектаў, іншыя.

Для адпрацоўкі прадугледжаных гэтай вучэбнай праграмай відаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці рэкамендуецца выкарыстоўваць урокі-практыкумы.

Дадзеная вучэбная праграма прадугледжвае правядзенне ўрокаў «Наш край». Мэта дадзеных урокаў – пазнаёміць вучняў з асаблівасцямі гістарычнага развіцця свайго рэгіёна. Пры вывучэнні краязнаўчага матэрыялу рэкамендуецца выкарыстоўваць гісторыка-дакументальную хроніку «Памяць»; праводзіць экскурсіі ў музеі і іншыя ўстановы, арганізоўваць вучэбна-даследчую дзейнасць вучняў.

Выбар метадаў навучання і выхавання, відаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вызначаецца педагагічным работнікам самастойна на аснове мэт і задач вывучэння пэўнай тэмы, сфармуляваных у дадзенай вучэбнай праграме патрабаванняў да вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў, іх узроставых і індывідуальных асаблівасцей.

6. Чаканыя вынікі асваення дадзенай вучэбнай праграмы:

6.1. асобасныя вынікі навучання арыентаваны на фарміраванне жыццёвага вопыту, светапогляду, асобаснай і грамадзянскай пазіцыі, каштоўнасных арыентацый асобы. Асобасныя вынікі засваення зместу вучэбнай праграмы выяўляюцца ў тым, што вучань:

кіруецца ў сваіх паводзінах традыцыйнымі каштоўнасцямі, прынятымі ў сучасным беларускім грамадстве;

вызначаецца нацыянальнай самасвядомасцю, пачуццём патрыятызму;

дэманструе сацыяльна актыўныя і адказныя паводзіны;

праяўляе гатоўнасць і здольнасць да ўзаемаразумення, дыялогу і супрацоўніцтва;

6.2. метапрадметныя вынікі навучання выяўляюцца ў тым, што вучань:

вызначае мэты свайго навучання, фармулюе суб'ектыўна новыя задачы ў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;

самастойна арганізуе сваю дзейнасць, плануе ўласныя вучэбныя дасягненні;

ажыццяўляе пазнавальную вучэбную дзейнасць на аснове сфарміраваных агульнавучэбных навыкаў;

валодае лагічнымі аперацыямі параўнання, аналізу, сінтэзу, абагульнення, устанаўлення аналогій і прычынна-выніковых сувязей паміж фактамі і з'явамі, доказу і абвяржэння;

рацыянальна тлумачыць на аснове сфарміраваных ведаў і аналізу ўласнага вопыту з'явы і падзеі сучаснага жыцця;

крытычна ўспрымае інфармацыю, атрыманую з розных крыніц, пісьменна інтэрпрэтуе і выкарыстоўвае яе ў адукацыйных і агульнакультурных мэтах;

удзельнічае ў праектнай дзейнасці ў камандзе або індывідуальна; публічна прадстаўляе распрацаваныя праекты, ацэньвае вынікі сумеснай працы і асабісты ўклад у дасягненне пастаўленых задач;

6.3. у адпаведнасці з прадметнымі вынікамі навучання вучням трэба засвоіць тэарэтычныя веды, якія характарызуюць гістарычны працэс у цэлым і розныя бакі грамадскага развіцця; найбольш істотныя прычынна-выніковыя сувязі; асноўныя гістарычныя паняцці ў іх сістэме і ўзаемасувязі.

Прадметныя вынікі навучання прадстаўлены ў «Асноўных патрабаваннях да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў» і сфармуляваны ў главе 2 дадзенай вучэбнай праграмы.

7. Змест навучання па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі» пабудаваны ў адпаведнасці з канцэнтрычным прынцыпам, што прадугледжвае засваенне зместу вучэбнага матэрыялу ў XI класе на праблемна-тэарэтычным узроўні.

## ГЛАВА 2
## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА Ў XI КЛАСЕ. АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

(4 гадзіны на тыдзень, усяго 136 гадзін)

### УВОДЗІНЫ (2 гадзіны)

Гісторыя і сучаснасць. Гістарычная перыядызацыя. Перыядызацыя сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі XIX – першай чвэрці XXI ст. Асноўныя тэндэнцыі развіцця свету ў XIX – першай чвэрці XXI ст. Асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі ў XIX – першай чвэрці XXI ст.

Асноўныя геапалітычныя працэсы ў свеце ў XIX – першай чвэрці XXI ст. Асаблівасці геапалітычнага становішча Беларусі.

# БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У XIX – ПАЧАТКУ XX ст.
(42 гадзіны)

XIX стагоддзе ў гісторыі свету і Беларусі (2 гадзіны). Палітычная карта свету ў пачатку XIX стагоддзя. Мадэрнізацыя і фарміраванне індустрыяльнага грамадства. Рэвалюцыі і рэформы. Этапы і асаблівасці мадэрнізацыі Расійскай імперыі і Беларусі. Этнічныя і сацыякультурныя працэсы. Век нацыяналізму і станаўлення новых дзяржаў. Станаўленне глабальнага свету. Беларусь і Расія.

Прамысловая рэвалюцыя (2 гадзіны). Прамысловая рэвалюцыя: сутнасць і асноўныя этапы. Роля навукі ў развіцці прамысловасці. Эканамічны рост Еўропы. Індустрыялізацыя і ўрбанізацыя. Эканамічныя наступствы прамысловай рэвалюцыі. Сацыяльныя змены і дэмаграфічная рэвалюцыя. Працоўны рух. Прафсаюзны рух.

Рэвалюцыі і нацыянальныя рухі ў свеце (2 гадзіны). Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці і ідэалогіі нацыяналізму. Рэвалюцыі і нацыянальныя рухі 1820-х гг. Рэвалюцыі 1830–1831 гг. Рэвалюцыі 1848–1849 гг. Уплыў рэвалюцыйных падзей у Еўропе на грамадскі рух у Расійскай імперыі і беларускіх губернях. Узнікненне новых нацыянальных дзяржаў у Еўропе і Лацінскай Амерыцы. Змены геапалітычнай сітуацыі ў Еўропе.

Асаблівасці развіцця краін Захаду і Усходу ў другой палове XIX – пачатку XX ст. (2 гадзіны). Асноўныя формы буржуазнай дзяржавы: канстытуцыйная манархія, прэзідэнцкая і парламенцкая рэспубліка. Палітычныя ідэалогіі: кансерватызм, лібералізм, сацыялізм. Палітычныя партыі. Змена сацыяльнай структуры. Эканамічнае развіццё краін Захаду. Імперыялізм. Традыцыйнае ўсходняе грамадства ва ўмовах каланіяльнай экспансіі.

Крызіс традыцыйнага грамадства ў краінах Усходу. Каланіялізм як ідэалогія і палітыка. Асноўныя этапы, формы і метады каланіяльнай эксплуатацыі. Метраполіі і калоніі. Каланіяльная сістэма. Індыя пад уладай англічан. Ператварэнне Кітая, Ірана і Асманскай імперыі ў паўкалоніі. Японскі вопыт мадэрнізацыі.

Завяршэнне каланіяльнага падзелу свету. Актывізацыя каланіяльнай экспансіі ў Азіі і Афрыцы. Канчатковы падзел свету на калоніі і сферы ўплыву. Наступствы каланіялізму для метраполій і калоній. Краіны Усходу ў эпоху «абуджэння Азіі». Іспанская і Партугальская Амерыка. Вызваленчая барацьба і дасягненне незалежнасці. Палітычнае развіццё Лацінскай Амерыкі.

Злучаныя Штаты Амерыкі ў XIX – пачатку XX ст. Экспансія Злучаных Штатаў Амерыкі на кантыненце. Грамадзянская вайна і яе вынікі. Паскарэнне эканамічнага росту. Прыток імігрантаў і іх амерыканізацыя. Працоўная міграцыя з тэрыторыі Беларусі. Асаблівасці амерыканскай палітычнай сістэмы.

Расійская імперыя ў XIX – пачатку XX ст. Рэформы дзяржаўнага кіравання. Эвалюцыя дзяржаўнага ладу. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Грамадскія рухі. Руская праваслаўная царква і яе ўплыў.

Беларусь у складзе Расійскай імперыі ў пачатку XIX ст. Дзяржаўна-прававы статус беларускіх губерняў. Сацыяльная і этнаканфесійная структура, узровень адукацыі насельніцтва беларускіх губерняў.

Напалеонаўскія войны і Беларусь. Напалеонаўскія войны: перыядызацыя, прычыны, характар. Змены ў Еўропе. Айчынная вайна 1812 г. Беларусь у Айчыннай вайне 1812 г. Наступствы напалеонаўскіх войнаў. Венская сістэма міжнародных адносін і асноўныя прынцыпы яе фарміравання.

Адмена прыгоннага права ў Расійскай імперыі. Прыгоннае права як сацыяльны інстытут і эканамічная сістэма. Аграрная рэформа. Буржуазныя рэформы 1860–1870-х гадоў і іх уплыў. Дасягненні, недахопы і супярэчнасці рэформ. Ацэнкі рэформ.

Развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. (2 гадзіны). Сельская гаспадарка ў першай палове XIX ст. Развіццё капіталізму ў сельскай гаспадарцы ў другой палове XIX ст. Аграрнае пытанне. Сусветны аграрны крызіс 80-х гг. XIX ст. і яго ўплыў. Асаблівасці правядзення аграрных пераўтварэнняў на тэрыторыі Беларусі, вынікі і наступствы. Змены ў беларускай вёсцы.

Прамысловы пераварот у Расійскай імперыі. Асноўныя этапы і асаблівасці. Змены ў прамысловасці. Вынікі прамысловага перавароту. Расійская імперыя ў сусветнай эканоміцы.

Беларусь на шляху да індустрыяльнага грамадства (2 гадзіны). Асаблівасці пераходу ад ручной вытворчасці да машыннай ў прамысловасці. Развіццё капіталістычных адносін. Манапалістычны капіталізм у Беларусі. Развіццё транспарту і гандлю. Урбанізацыя. Фарміраванне нацыянальнага рынку. Вынікі прамысловага развіцця. Прыватнае прадпрымальніцтва.

Сацыяльныя наступствы прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі. Змена сацыяльнай структуры беларускага грамадства. Станаўленне класаў і слаёў буржуазнага грамадства. Становішча сялян і рабочых. Працоўныя міграцыі. Перасяленчы рух.

Грамадска-палітычныя рухі ў Беларусі ў XIX ст. (2 гадзіны). Праекты грамадска-палітычнага і культурнага развіцця беларускіх зямель.

Нацыянальныя рухі: прычыны, мэты, характар, плыні. Польскае пытанне і шляхецкія паўстанні. Уплыў расійскага грамадска-палітычнага руху. Дзейнасць народніцкіх арганізацый. Народніцтва і нацыянальнае пытанне. Узмацненне ўплыву праваслаўнай царквы. Каталіцтва. Міжканфесійныя адносіны.

Грамадска-палітычная барацьба ў Беларусі ў пачатку XX ст. (2 гадзіны). Пачатак дзейнасці палітычных партый на тэрыторыі Беларусі. Рэвалюцыя 1905–1907 гг.: перыядызацыя, перадумовы, вынікі. Рэвалюцыя 1905–1907 гг. на тэрыторыі Беларусі. Беларускі нацыянальна-культурны рух.

Ад беларускай народнасці да беларускай нацыі (2 гадзіны). Паняцце «нацыя». Умовы і перадумовы фарміравання беларускай нацыі. Развіццё навуковых ведаў пра Беларусь і беларускі народ. Фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці. Беларуская нацыянальная ідэя. Станаўленне беларускай нацыянальнай гістарыяграфіі.

Беларускае грамадства ў пачатку XX ст. Дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі. Міграцыя насельніцтва. Сацыяльны, нацыянальны і канфесійны склад насельніцтва. Адукацыйны ўзровень насельніцтва. Фарміраванне інтэлектуальнай эліты.

Развіццё культуры Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. (2 гадзіны). Прамысловая рэвалюцыя і тэхнічны прагрэс. Уплыў прамысловай рэвалюцыі на развіццё культуры. Новыя з’явы ў культуры. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці літаратуры і мастацтва. Польскі і расійскі ўплыў. Народная і шляхецкая культура. Культура нацыянальных меншасцяў. Станаўленне новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Адукацыя і навука. Перыядычны друк. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці мастацтва.

Першая сусветная вайна як рубежны перыяд сусветнай гісторыі (2 гадзіны). Крах Венскай сістэмы міжнародных адносін. Сістэма ваенна-палітычных блокаў і саюзаў у другой палове XIX – пачатку XX ст. Прычыны і характар Першай сусветнай вайны. Асноўныя ўдзельнікі і іх мэты. Тэатры ваенных дзеянняў. Новае аблічча вайны. Расійская імперыя ў Першай сусветнай вайне. Геапалітычныя наступствы і гістарычныя ўрокі Першай сусветнай вайны.

Беларусь у гады Першай сусветнай вайны (2 гадзіны). Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Насельніцтва Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны. Бежанскі рух. Акупацыйны рэжым. Ураджэнцы Беларусі на франтах Першай сусветнай вайны. Рабочыя і сялянскія пратэсты. Беларускі нацыянальны рух. Брэсцкі мірны дагавор. Наступствы Першай сусветнай вайны для Беларусі.

Урок-практыкум (2 гадзіны).

Урок абагульнення (2 гадзіны).

Урок «Наш край» (2 гадзіны).

Праектная дзейнасць (2 гадзіны).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

перыядызацыю сусветнай і гісторыі Беларусі XIX – першай чвэрці XXI ст.

вызначэнні паняццяў: глабалізацыя, індустрыяльнае грамадства, нацыянальны рух, манаполія, імперыялізм, рэкруцкая павіннасць, выкупныя плацяжы, часоваабавязаныя сяляне, водруб, хутар, забастоўка, аўтаномія, заходнерусізм, нацыянальная самасвядомасць, нацыянальная ідэя, беларусазнаўства, сусветная вайна, аграрнае пытанне, «амерыканскі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, Венская сістэма міжнародных адносін, дэмаграфічная рэвалюцыя, прыгоннае права, мадэрнізацыя, манапалістычны капіталізм, нацыяналізм, «прускі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы;

асноўныя працэсы палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў XIX – пачатку XX ст.;

умець:

лакалізаваць у часе вывучаныя гістарычныя факты;

сінхранізаваць з’явы і працэсы, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнах свету ў XIX – пачатку XX ст.;

лакалізаваць у прасторы вывучаныя падзеі, з'явы, працэсы; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гістарычных падзеях, з'явах, працэсах;

фармуляваць вызначэнні паняццяў на аснове выяўлення іх істотных прыкмет: глабалізацыя, індустрыяльнае грамадства, нацыянальны рух, манаполія, імперыялізм, рэкруцкая павіннасць, выкупныя плацяжы, часоваабавязаныя сяляне, водруб, хутар, забастоўка, аўтаномія, заходнерусізм, нацыянальная самасвядомасць, нацыянальная ідэя, беларусазнаўства, сусветная вайна, аграрнае пытанне, «амерыканскі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы, буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя, Венская сістэма міжнародных адносін, дэмаграфічная рэвалюцыя, прыгоннае права, мадэрнізацыя, манапалістычны капіталізм, нацыяналізм, «прускі» шлях развіцця капіталізму ў сельскай гаспадарцы; канкрэтызаваць іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з’яў, працэсаў);

характарызаваць асаблівасці грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця беларускіх губерняў ў кантэксце сусветнай гісторыі ў XIX – пачатку XX ст. з апорай на розныя крыніцы інфармацыі;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі: прычыны і наступствы прамысловай рэвалюцыі, прычыны і наступствы нацыянальных рухаў у XIX ст.; прычыны і наступствы адмены прыгоннага права; прычыны і наступствы Сталыпінскай рэформы; прычыны і наступствы Першай сусветнай вайны

параўноўваць гістарычныя факты, звязаныя з развіццём Беларусі і іншых тэрыторый у XIX – пачатку XX ст. па самастойна выбраных крытэрыях; фармуляваць аргументаваныя высновы аб месцы Беларусі ў сусветнай гісторыі;

параўноўваць і тлумачыць розныя пункты гледжання па пытаннях грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі ў XIX – пачатку XX ст.;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць вывучаныя гістарычныя факты аб грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным, культурным развіцці Беларусі ў XIX – пачатку XX ст. па самастойна вызначаных крытэрыях і фармуляваць на гэтай аснове аргументаваныя высновы;

прэзентаваць паведамленні аб грамадска-палітычным сацыяльна-эканамічным, культурным развіцці Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі, аб дзейнасці гістарычных асоб у XIX – пачатку XX ст., падрыхтаваныя з выкарыстаннем розных крыніц інфармацыі (даведнікаў, энцыклапедый, інтэрнэту);

фармуляваць уласныя ацэначныя меркаванні па пытаннях грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі ў XIX – пачатку XX ст.;

устанаўліваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе вырашэння вучэбных задач;

перакладаць вербальную інфармацыю ў наглядна-вобразную і наадварот;

адрозніваць гістарычны факт ад яго інтэрпрэтацыі.

Прымяняць засвоеныя веды і ўменні для:

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні музеяў;

аналізу сучаснай сацыяльнай інфармацыі, прадстаўленай у сродках масавай інфармацыі;

вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных падзей, з’яў, працэсаў;

рашэння вучэбных і практычных задач, якія патрабуюць інтэграцыі ведаў з розных вучэбных прадметаў;

выканання творчых заданняў, праектаў, вучэбна-даследчых работ і тлумачэння іх вынікаў;

свядомых паводзін як прадстаўніка грамадзянскай, этнакультурнай супольнасці, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

## БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У 1917–1945 гг.
## (39 гадзін)

Тэндэнцыі гістарычнага развіцця ў 1917–1945 гг. (2 гадзіны). Найноўшая гісторыя: перыядызацыя і змест. Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін: этапы і асаблівасці фарміравання, прынцыпы, супярэчнасці. Стварэнне Лігі Нацый. Геапалітычнае значэнне стварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік (далей – СССР). Нацыяналізм і мілітарызм у Еўропе і свеце. Другая Сусветная вайна як геапалітычны канфлікт. Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў міжваенны перыяд.

Расія ў 1917 г.: Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі. Падзенне манархіі. Двоеўладдзе і яго сутнасць. Кастрычніцкая рэвалюцыя і яе характар. Значэнне і наступствы Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый.

Беларусь у Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцыях 1917 г. (2 гадзіны). Падзеі Лютаўскай рэвалюцыі ў Беларусі. Уплыў рэвалюцыі на ўздым беларускага нацыянальнага руху. Падзеі Кастрычніцкай рэвалюцыі на тэрыторыі Беларусі. Усебеларускі з’езд.

Краіны Захаду ў міжваенны перыяд. Асноўныя этапы развіцця краін Захаду ў міжваенны перыяд. Змены на палітычнай карце Еўропы пасля Першай сусветнай вайны. Пасляваенны крызіс. Сацыяльныя і палітычныя перамены. Эканамічны ўздым у сярэдзіне – другой палове 1920-х гг. Сусветны эканамічны крызіс і яго наступствы.

Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў міжваенны перыяд. Тэрытарыяльны перадзел свету пасля Першай сусветнай вайны. Нацыянальна-вызваленчыя рухі і іх ідэалогіі: гандызм, суньятсэнізм, ісламскі нацыяналізм, кемалізм. Асаблівасці развіцця краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

Навука і культура ва ўмовах крызісу індустрыяльнага грамадства. Супярэчлівы характар развіцця навукі. Адукацыя ў індустрыяльным грамадстве. Новыя тэндэнцыі ў развіцці літаратуры і мастацтва ў міжваенны перыяд.

Савецкае дзяржаўнае будаўніцтва ў 1917–1939 гг. (2 гадзіны). Грамадзянская вайна: асноўныя этапы, удзельнікі і іх мэты, наступствы.

Замежная ваенная інтэрвенцыя: удзельнікі, мэты, вынікі. Першыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні савецкай улады. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва. Утварэнне СССР. Асноўныя рысы савецкай палітычнай сістэмы. Савецкая мадэрнізацыя. Знешняя палітыка СССР. Вынікі палітычнай і эканамічнай трансфармацыі.

Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў Беларусі (2 гадзіны). Гістарычныя ўмовы стварэння беларускай дзяржавы. Утварэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. Стварэнне Літоўска-Беларускай савецкай сацыялістычнай рэспублікі і абвяшчэнне незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. Польска-савецкая вайна 1919–1920 гг. Рыжскі мірны дагавор: наступствы для Беларусі. Удзел Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі ва ўтварэнні СССР. Фарміраванне тэрыторыі Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі (далей – БССР). Канстытуцыйнае будаўніцтва, органы ўлады і кіравання БССР у міжваенны перыяд.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у 1920–1930-я гг. (3 гадзіны). Новая эканамічная палітыка і савецкая мадэрнізацыя ў БССР: змест, прычыны, спосабы рэалізацыі. Рэалізацыя нацыянальнай палітыкі. Палітыка беларусізацыі. Вынікі сацыяльна-эканамічных пераўтварэнняў.

Заходняя Беларусь у 1921–1939 гг. (2 гадзіны). Тэрыторыя, насельніцтва. Аграрна-сыравінны характар эканомікі Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы. Нацыянальная і канфесійная палітыка польскіх уладаў. Паланізацыя. Санацыя. Асадніцтва. Нацыянальна-вызваленчы, сялянскі і рабочы рух. Этнічная асіміляцыя: мэты, шляхі ажыццяўлення. Стан беларускай культуры.

Станаўленне культуры савецкага грамадства ў 1920–1930-я гг. Асноўныя тэндэнцыі развіцця савецкай культуры ў 1920–1930-я гг. Барацьба з непісьменнасцю. Асноўныя напрамкі ў літаратуры і мастацтве. Савецкі авангард. Паўсядзённае жыццё і грамадскія настроі. Сродкі масавай інфармацыі.

Развіццё культуры Савецкай Беларусі ў міжваенны перыяд (2 гадзіны). Палітыка Савецкай дзяржавы ў галіне культуры. Адукацыя ў Савецкай Беларусі. Станаўленне беларускай навукі. Дасягненні ў развіцці беларускай мовы і літаратуры, драматургіі, музыкі, тэатра і кіно. Традыцыйная культура. Тэндэнцыі ў развіцці беларускага мастацтва.

Фашызм у Еўропе і свеце. Фашызм як ідэалогія і форма дзяржаўнага кіравання. Усталяванне фашысцкага рэжыму ў Італіі і нацысцкага рэжыму ў Германіі. Распаўсюджванне фашызму ў Еўропе. Мілітарызм у Японіі.

Міжнароднае становішча напярэдадні Другой сусветнай вайны. (2 гадзіны). Агрэсіўная палітыка Германіі, Італіі і Японіі ў 1930-я гады.

Палітыка прымірэння агрэсара. Мюнхенскі дагавор і яго роля ў развязванні вайны. Дзейнасць СССР у кантэксце геапалітычнай сітуацыі ў свеце.

Другая сусветная вайна. Асноўныя ўдзельнікі і іх геапалітычныя мэты. Перыядызацыя Другой сусветнай вайны. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Сацыяльна-эканамічныя і палітычныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі пасля ўз’яднання. Значэнне ўз’яднання. Асноўныя тэатры ваенных дзеянняў. Рух супраціву. Дзейнасць антыгітлераўскай кааліцыі: дасягненні і праблемы. Наступствы Другой сусветнай вайны.

Вялікая Айчынная вайна (3 гадзіны). Планы нацысцкай Германіі адносна СССР. Эканамічны патэнцыял нацысцкай Германіі і яе саюзнікаў. Характар вайны. Палітыка германскіх уладаў на акупіраваных тэрыторыях. Арганізацыя кіравання Савецкай дзяржавай у ваенных умовах. Перабудова савецкай эканомікі на ваенны лад, арганізацыя ваенна-прамысловай вытворчасці, адзінства арміі і тылу ў СССР. Добраахвотная самамабілізацыя грамадства. Стаўленне Савецкай дзяржавы да Рускай праваслаўнай царквы. Ленд-ліз і яго значэнне. Асноўныя падзеі Вялікай Айчыннай вайны. Партызанскі і падпольны рух. Ваенная эканоміка, уклад працаўнікоў тылу ў Вялікую Перамогу. Вытокі духоўнай стойкасці савецкага народа. Цана Перамогі. Роля Савецкага Саюза ў Вялікай Перамозе.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне (4 гадзіны). Абарончыя баі на тэрыторыі БССР і іх значэнне. Насельніцтва Беларусі ва ўмовах акупацыі. Генацыд беларускага народа. Эканамічная эксплуатацыя акупіраваных тэрыторый. Калабарацыянізм: прычыны і формы. Масавая барацьба супраць нацысцкіх захопнікаў. Партызанскі і падпольны рух на тэрыторыі Беларусі. Захаванне беларускай дзяржаўнасці ў гады вайны. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Аперацыя «Баграціён». Уклад беларускага народа ў Перамогу над нацысцкай Германіяй і мілітарысцкай Японіяй. Наступствы вайны для Беларусі.

Урок-практыкум (2 гадзіны).

Урок абагульнення (2 гадзіны).

Урок «Наш край» (2 гадзіны).

Праектная дзейнасць (2 гадзіны).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

этапы станаўлення беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці;

перыядызацыю гісторыі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў;

вызначэнні паняццяў: аўтарытарны рэжым, Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін, нацызм, мілітарызм, метад сацыялістычнага рэалізму, агрэсія, антыгітлераўская кааліцыя, беларуская нацыянальная дзяржаўнасць, генацыд, калабарацыянізм, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, культурная рэвалюцыя, індустрыялізацыя, сусветны эканамічны крызіс, акупацыя, асадніцтва, палітыка прымірэння агрэсара, сацыялістычная рэвалюцыя, фашызм;

асноўныя працэсы палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі ў 1917–1945 гг.;

асноўныя падзеі Другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў;

сімвалы і месцы памяці беларускага народа аб Вялікай Айчыннай вайне;

умець:

лакалізаваць у часе вывучаныя гістарычныя факты;

сінхранізаваць з’явы і працэсы, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнах свету ў 1917–1945 гг.;

характарызаваць гістарычныя і нацыянальныя формы беларускай дзяржаўнасці;

лакалізаваць у прасторы вывучаныя падзеі, з'явы, працэсы; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гістарычных падзеях, з'явах, працэсах;

фармуляваць вызначэнні паняццяў на аснове выяўлення іх істотных прыкмет: аўтарытарны рэжым, Версальска-Вашынгтонская сістэма міжнародных адносін, нацызм, мілітарызм, метад сацыялістычнага рэалізму, агрэсія, антыгітлераўская кааліцыя, беларуская нацыянальная дзяржаўнасць, генацыд, калабарацыянізм, калектывізацыя сельскай гаспадаркі, культурная рэвалюцыя, індустрыялізацыя, сусветны эканамічны крызіс, акупацыя, асадніцтва, палітыка прымірэння агрэсара, сацыялістычная рэвалюцыя, фашызм; канкрэтызаваць іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з’яў, працэсаў);

характарызаваць асаблівасці грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў 1917–1945 гг. ў кантэксце сусветнай гісторыі з апорай на розныя крыніцы інфармацыі;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі: прычыны і наступствы Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый 1917 г.; прычыны і наступствы ўз'яднання Заходняй Беларусі з БССР; прычыны і наступствы Вялікай Айчыннай вайны;

параўноўваць гістарычныя факты, звязаныя з развіццём Беларусі і іншых тэрыторый у 1917–1945 гг. па самастойна выбраных крытэрыях; фармуляваць аргументаваныя высновы аб месцы Беларусі ў сусветнай гісторыі;

параўноўваць і тлумачыць розныя пункты гледжання па пытаннях грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі ў 1917–1945 гг.;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць вывучаныя гістарычныя факты аб грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным, культурным развіцці Беларусі ў 1917–1945 гг. па самастойна вызначаных крытэрыях і фармуляваць на гэтай аснове аргументаваныя высновы;

прэзентаваць паведамленні аб грамадска-палітычным сацыяльна-эканамічным, культурным развіцці Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі, аб дзейнасці гістарычных асоб у 1917–1945 гг., падрыхтаваныя з выкарыстаннем розных крыніц інфармацыі (даведнікаў, энцыклапедый, інтэрнэту);

фармуляваць уласныя ацэначныя меркаванні па пытаннях грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі ў 1917–1945 гг.;

устанаўліваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе вырашэння вучэбных задач;

перакладаць вербальную інфармацыю ў наглядна-вобразную і наадварот;

адрозніваць гістарычны факт ад яго інтэрпрэтацыі.

Прымяняць засвоеныя веды і ўменні для:

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні музеяў;

аналізу сучаснай сацыяльнай інфармацыі, прадстаўленай у сродках масавай інфармацыі;

вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных падзей, з’яў, працэсаў;

рашэння вучэбных і практычных задач, якія патрабуюць інтэграцыі ведаў з розных вучэбных прадметаў;

выканання творчых заданняў, праектаў, вучэбна-даследчых работ і тлумачэння іх вынікаў;

свядомых паводзін як прадстаўніка грамадзянскай, этнакультурнай супольнасці, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

## БЕЛАРУСЬ І СВЕТ
## У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ 40-Х ГАДОЎ – ПАЧАТКУ 90-Х ГАДОЎ XX ст.
## (24 гадзіны)

Свет у другой палове 40-х гадоў – пачатку 90-х гадоў XX ст. Ялцінска-Патсдамская сістэма міжнародных адносін. Фарміраванне двухполюснага свету. Крушэнне каланіяльнай сістэмы.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя і фарміраванне постіндустрыяльнага грамадства. Навукова-тэхнічны прагрэс. Навукова-тэхнічная рэвалюцыя (далей – НТР): сутнасць і яе напрамкі. Інфармацыйная рэвалюцыя як складнік НТР і яе ўплыў на развіццё грамадства. НТР і глабалізацыя. Наступствы НТР.

Краіны Захаду (2 гадзіны). Паняцце «заходні свет». Палітычная сістэма краін Захаду. Эканамічная сістэма краін Захаду. Еўрапейскі саюз: этапы стварэння і палітычны лад. Эканоміка Еўрапейскага Саюза.

Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы (2 гадзіны). Асноўныя этапы развіцця. Агульнадэмакратычны характар пераўтварэнняў 1945–1947 гг. Будаўніцтва сацыялізму: дасягненні і праблемы. «Аксамітныя рэвалюцыі» і іх вынікі. Фарміраванне новых палітычных і сацыяльна-эканамічных сістэм.

Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі (2 гадзіны). Дэкаланізацыя і яе асноўныя этапы. Тэорыі мадэрнізацыі. Шляхі развіцця краін, якія вызваліліся.

Вядучыя краіны Усходу пасля Другой сусветнай вайны (2 гадзіны). Утварэнне Кітайскай Народнай Рэспублікі і будаўніцтва сацыялізму ў 1950-я – 1970-я гг. Кітай у перыяд рэформаў, сацыялізм з кітайскай спецыфікай. Асноўныя этапы эканамічнага і сацыяльна-палітычнага развіцця Японіі пасля Другой сусветнай вайны. Заваёва Індыяй незалежнасці і ажыццяўленне «курсу Неру». Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-палітычнага і эканамічнага развіцця Індыі.

СССР у пасляваенны перыяд (1945–1991 гг.) (2 гадзіны). Палітычная сістэма. Узаемаадносіны ўлады і грамадства: асноўныя этапы развіцця. Напрамкі і вынікі рэфармавання сацыяльна-эканамічнай сістэмы СССР. Дасягненні і праблемы савецкай сацыяльнай палітыкі і эканомікі. Маральныя нормы і маральныя каштоўнасці савецкага чалавека. Асноўныя тэндэнцыі развіцця савецкай культуры.

Палітычнае развіццё БССР у другой палове 1940-х – 1991 гг. (2 гадзіны). Асноўныя тэндэнцыі палітычнага развіцця БССР пасля Вялікай Айчыннай вайны. Палітычная сістэма БССР. Умацаванне беларускай дзяржаўнасці. Дзейнасць Саветаў і грамадскіх арганізацый. Стаўленне да царквы. Рашэнне нацыянальнага пытання. БССР на міжнароднай арэне.

Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР у другой палове 1940-х – 1991 гг. (2 гадзіны). Подзвіг беларускага народа па аднаўленні эканомікі. Дапамога саюзных рэспублік. Асноўныя этапы развіцця эканомікі БССР.

Структура эканомікі. Сацыяльнае развіццё. БССР у народна-гаспадарчым комплексе Савецкага Саюза. Эканамічныя рэформы і іх вынікі.

Навука, культура, адукацыя ў БССР у другой палове 1940-х – 1991 гг. (2 гадзіны). Развіццё культуры і мастацтва ў БССР ў другой палове 1940- х – 1991 гг. Дасягненні БССР у галіне навукі. Развіццё адукацыі ў БССР.

Урок-практыкум (2 гадзіны).

Урок абагульнення (1 гадзіна).

Урок «Наш край» (1 гадзіна).

Праектная дзейнасць (2 гадзіны).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

вызначэнні паняццяў: інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі, інфармацыйная рэвалюцыя, навукова-тэхнічны прагрэс, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, постіндустрыяльнае (інфармацыйнае) грамадства, экстэнсіўны шлях развіцця эканомікі, інтэграцыя, перабудова, стагнацыя, «халодная вайна»;

асноўныя працэсы палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця Беларусі ў другой палове 40-х – пачатку 90-х гг. ХХ ст.;

умець:

лакалізаваць у часе вывучаныя гістарычныя факты;

сінхранізаваць з’явы і працэсы, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнах свету ў другой палове 40-х – пачатку 90-х гг. ХХ ст.;

лакалізаваць у прасторы вывучаныя падзеі, з'явы, працэсы; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гістарычных падзеях, з'явах, працэсах;

фармуляваць вызначэнні паняццяў на аснове выяўлення іх істотных прыкмет: інтэнсіўны шлях развіцця эканомікі, інфармацыйная рэвалюцыя, навукова-тэхнічны прагрэс, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, постіндустрыяльнае (інфармацыйнае) грамадства, экстэнсіўны шлях развіцця эканомікі, інтэграцыя, перабудова, стагнацыя, «халодная вайна»; канкрэтызаваць іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з’яў, працэсаў);

характарызаваць асаблівасці грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў другой палове 40-х – пачатку 90-х гг. ХХ ст. у кантэксце сусветнай гісторыі з апорай на розныя крыніцы інфармацыі;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі: прычыны і наступствы навукова-тэхнічнай рэвалюцыі; прычыны і наступствы глабалізацыі; прычыны і наступствы дэкаланізацыі;

параўноўваць гістарычныя факты, звязаныя з развіццём Беларусі і іншых тэрыторый у другой палове 40-х – пачатку 90-х гг. XX ст. па самастойна выбраных крытэрыях; фармуляваць аргументаваныя высновы аб месцы Беларусі ў сусветнай гісторыі;

параўноўваць і тлумачыць розныя пункты гледжання па пытаннях грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця і геапалітычнага становішча БССР у кантэксце сусветнай гісторыі ў другой палове 40-х – пачатку 90-х гг. XX ст.;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць вывучаныя гістарычныя факты аб грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным, культурным развіцці Беларусі ў другой палове 40-х – пачатку 90-х гг. XX ст. па самастойна вызначаных крытэрыях і фармуляваць на гэтай аснове аргументаваныя высновы;

прэзентаваць паведамленні аб грамадска-палітычным сацыяльна-эканамічным, культурным развіцці Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі, аб дзейнасці гістарычных асоб у другой палове 40-х – пачатку 90- х гг. XX ст., падрыхтаваныя з выкарыстаннем розных крыніц інфармацыі (даведнікаў, энцыклапедый, інтэрнэту);

фармуляваць уласныя ацэначныя меркаванні па пытаннях грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі ў другой палове 40-х – пачатку 90-х гг. XX ст.;

устанаўліваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе вырашэння вучэбных задач;

перакладаць вербальную інфармацыю ў наглядна-вобразную і наадварот;

адрозніваць гістарычны факт ад яго інтэрпрэтацыі.

Прымяняць засвоеныя веды і ўменні для:

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні музеяў;

аналізу сучаснай сацыяльнай інфармацыі, прадстаўленай у сродках масавай інфармацыі;

вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных падзей, з’яў, працэсаў;

рашэння вучэбных і практычных задач, якія патрабуюць інтэграцыі ведаў з розных вучэбных прадметаў;

выканання творчых заданняў, праектаў, вучэбна-даследчых работ і тлумачэння іх вынікаў;

свядомых паводзін як прадстаўніка грамадзянскай, этнакультурнай супольнасці, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

## РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ І СВЕТ У КАНЦЫ XX – ПЕРШАЙ ЧВЭРЦІ XXI ст. (25 гадзін)

Свет у канцы XX – першай чвэрці XXI ст. Геапалітычныя наступствы распаду СССР. Глабалізацыя. Постіндустрыяльнае грамадства. Ад аднапалярнасці да шматпалярнага свету. «Каляровыя рэвалюцыі».

Краіны Захаду, Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Сучасная палітычная сістэма краін Захаду. Эканамічная сістэма краін Захаду на сучасным этапе. Крызіс «дзяржавы дабрабыту». Сучасныя праблемы еўраінтэграцыі. Праблемы незалежнага развіцця і мадэрнізацыі краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Неакаланіялізм. Краіны глабальнага Поўдня і іх роля ў сучасным свеце.

Расійская Федэрацыя (2 гадзіны). Распад СССР. Дзяржаўна-палітычнае развіццё Расійскай Федэрацыі. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні ў Расійскай Федэрацыі. Расійская Федэрацыя на міжнароднай арэне.

Рэспубліка Беларусь у першай палове 1990-х гг. Абвяшчэнне дзяржаўнага суверэнітэту. Грамадска-палітычны і сацыяльна-эканамічны крызіс. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. Структура і функцыі органаў улады. Прэзідэнцкія выбары 1994 г.

Прэзідэнцкая рэспубліка – гістарычны выбар беларускага народа (2 гадзіны). Рэферэндум 1995 г. Гістарычнае значэнне рэферэндуму 1996 г. Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь: месца і роля ў сістэме дзяржаўнага кіравання. Паўнамоцтвы, функцыі і дзейнасць. Рэферэндумы 2004, 2022 гг. Усебеларускі народны сход.

Сістэма мясцовага кіравання і самакіравання ў сучаснай Беларусі. Органы мясцовага кіравання і самакіравання і іх функцыі. Асноўныя прынцыпы мясцовага кіравання і самакіравання. Эканамічная аснова мясцовага кіравання і самакіравання. Арганізацыя работы органаў улады з насельніцтвам.

Эканамічнае развіццё сучаснай Беларусі (2 гадзіны). Беларуская мадэль эканамічнага развіцця. Стратэгічныя напрамкі развіцця эканомікі. Найважнейныя эканамічныя дасягненні Рэспублікі Беларусь у 1994–2025 гг. Эканамічная інтэграцыя. Выклікі і пагрозы эканамічнай бяспекі.

Сацыяльная палітыка ў сучаснай Беларусі. Рэспубліка Беларусь – сацыяльна арыентаваная дзяржава. Павышэнне дабрабыту насельніцтва.

Палітыка дзяржавы ў галіне адукацыі і аховы здароўя. Дзяржаўная падтрымка інстытута сям'і. Рынак працы. Асновы маладзёжнай палітыкі.

Сучаснае беларускае грамадства. Міжнацыянальныя адносіны. Канфесійная палітыка дзяржавы. Каштоўнасныя арыентацыі. Гістарычная палітыка Рэспублікі Беларусь.

Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі ў сучаснай Беларусі. Месца грамадскіх аб'яднанняў у сістэме адносін улады і грамадства. Партыйная сістэма. Грамадскія арганізацыі і рухі.

Рэспубліка Беларусь у свеце (2 гадзіны). Геапалітычнае становішча. Шматвектарны характар знешняй палітыкі. Удзел у інтэграцыйных працэсах (Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, Еўразійскі эканамічны саюз, Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва, БРІКС). Дзейнасць у міжнародных арганізацыях.

Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі. Асноўныя этапы станаўлення міждзяржаўных адносін Беларусі і Расіі пасля распаду СССР. Фарміраванне адзінай эканамічнай, сацыяльнай і тэхналагічнай прасторы. Узаемадзеянне ў сферы знешняй палітыкі і бяспекі. Рэгіянальнае супрацоўніцтва.

Культура сучаснай Беларусі. Прыярытэтныя напрамкі развіцця навукі. Інавацыйнае і навукова-тэхналагічнае развіццё. Дзяржаўная палітыка ў галіне культуры. Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны. Спартыўныя дасягненні.

Урок-практыкум (2 гадзіны).

Урок абагульнення.

Урок «Наш край» (2 гадзіны).

Праектная дзейнасць (2 гадзіны).

Заключэнне. Свет у першай чвэрці XXI ст. Праблемы сучаснага свету. Глабалізацыя і яе наступствы. Ачагі канфліктаў і супрацьстаяння ў свеце. Фарміраванне «новага сусветнага парадку». Сучасныя выклікі і магчымасці для Беларусі. Гістарычная памяць як фактар кансалідацыі беларускага грамадства.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

ведаць:

этапы станаўлення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь

вызначэнні паняццяў: неакаланіялізм, «каляровыя рэвалюцыі», рэферэндум, дзяржаўны суверэнітэт, Канстытуцыя, прэзідэнцкая рэспубліка, сацыяльна арыентаваная эканоміка, грамадзянская супольнасць, Белавежскія пагадненні, глабальныя праблемы чалавецтва,

грамадзянства, нацыянальныя інтарэсы, прававая дзяржава, прыватызацыя, сацыяльная дзяржава, унітарная дзяржава, устойлівае развіццё;

асноўныя працэсы палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў 1991 г. – першай чвэрці XXI ст.;

умець:

лакалізаваць у часе вывучаныя гістарычныя факты;

сінхранізаваць з’явы і працэсы, якія адбываліся ў гісторыі Беларусі і іншых рэгіёнах свету ў 1991 г. – першай чвэрці XXI ст.;

лакалізаваць у прасторы вывучаныя падзеі, з'явы, працэсы; выкарыстоўваць гістарычную карту як крыніцу інфармацыі аб гістарычных падзеях, з'явах, працэсах;

фармуляваць вызначэнні паняццяў на аснове выяўлення іх істотных прыкмет: неакаланіялізм, «каляровыя рэвалюцыі», рэферэндум, дзяржаўны суверэнітэт, Канстытуцыя, прэзідэнцкая рэспубліка, сацыяльна арыентаваная эканоміка, грамадзянская супольнасць, Белавежскія пагадненні, глабальныя праблемы чалавецтва, грамадзянства, нацыянальныя інтарэсы, прававая дзяржава, прыватызацыя, сацыяльная дзяржава, унітарная дзяржава, устойлівае развіццё; канкрэтызаваць іх прыкладамі вывучаных гістарычных фактаў (падзей, з’яў, працэсаў);

характарызаваць асаблівасці грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў 1991 г. – першай чвэрці XXI ст. у кантэксце сусветнай гісторыі з апорай на розныя крыніцы інфармацыі;

устанаўліваць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі: прычыны і наступствы «каляровых рэвалюцый»;

параўноўваць гістарычныя факты, звязаныя з развіццём Беларусі і іншых тэрыторый у 1991 г. – першай чвэрці XXI ст. па самастойна выбраных крытэрыях; фармуляваць аргументаваныя высновы аб месцы Беларусі ў сусветнай гісторыі;

параўноўваць і тлумачыць розныя пункты гледжання па пытаннях грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 1991 г. – першай чвэрці XXI ст. у кантэксце сусветнай гісторыі;

сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць вывучаныя гістарычныя факты аб грамадска-палітычным, сацыяльна-эканамічным, культурным развіцці Беларусі ў 1991 г. – першай чвэрці XXI ст. па самастойна вызначаных крытэрыях і фармуляваць на гэтай аснове аргументаваныя высновы;

прэзентаваць паведамленні аб грамадска-палітычным сацыяльна-эканамічным, культурным развіцці Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі, аб дзейнасці гістарычных асоб у 1991 г. – першай чвэрці XXI ст.,

падрыхтаваныя з выкарыстаннем розных крыніц інфармацыі (даведнікаў, энцыклапедый, інтэрнэту);

фармуляваць уласныя ацэначныя меркаванні па пытаннях грамадска-палітычнага, сацыяльна-эканамічнага, культурнага развіцця Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі ў 1991 г. – першай чвэрці XXI ст.;

устанаўліваць унутрыпрадметныя і міжпрадметныя сувязі ў працэсе вырашэння вучэбных задач;

перакладаць вербальную інфармацыю ў наглядна-вобразную і наадварот;

адрозніваць гістарычны факт ад яго інтэрпрэтацыі.

Прымяняць засвоеныя веды і ўменні для:

тлумачэння гістарычнага кантэксту пры чытанні мастацкай літаратуры, праглядзе фільмаў, наведванні музеяў;

аналізу сучаснай сацыяльнай інфармацыі, прадстаўленай у сродках масавай інфармацыі;

вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных падзей, з’яў, працэсаў;

рашэння вучэбных і практычных задач, якія патрабуюць інтэграцыі ведаў з розных вучэбных прадметаў;

выканання творчых заданняў, праектаў, вучэбна-даследчых работ і тлумачэння іх вынікаў;

свядомых паводзін як прадстаўніка грамадзянскай, этнакультурнай супольнасці, грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Выніковае абагульненне (2 гадзіны).